БІБЛІЯТЭКА 13

Эдуард Акулін

Плашчаніца



Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў
Мінск
2020

Бібліятэка 13

Плашчаніца

Аўтар вершаў:
Эдуард Акулін

Мастакі:
Мікола Шындзік Зоран Крычка
Святлана Паўловіч Джындо
Вера Станарчэвіч Міадраг Младжовіч
Прэдраг Драговіч Міленко Міхайловіч
Ёшкін Шылян Таміслаў Тадаровіч
Мар’ян Флоршыц Здраўка Велован
Србослаў Іліч

Пераклад вершаў:
Міадраг Сібіновіч

Аўтар праекта і рэдактар выдання:
Мікола Шындзік

Афармленне кнігі і вёрстка тэкста:
Мікола Шындзік

Библиотека 13

Плаштаница

Аутор стихова:
Едуард Акулин

Ликовни уметници:
Никола Шиндик Зоран Кричка
Светлана Павловић Џиндо
Вера Станарчевић Миодраг Млађовић
Предраг Драговић Миленко Михајловић
Јошкин Шиљан Томислав Тодоровић
Марјан Флоршиц Здравко Велован
Србослав Илић

Превод стихова:
МиодрагСибиновић

Аутор пројекта и уредник издања:
Никола Шиндик

Опрема књиге и прелом текста:
Шиндик и Шиндик

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
А 44

Мастак Мікола Шындзік

Акулін Э.А.
А 44 «Плашчаніца»: кніга паэзіі/ Эдуард Акулін, мастак Мікола Шындзік, — Мінск: Палікрафт, 2020 — 48 с.

Кніга «Плашчаніца» — вынік творчага сумоўя Эдуарда Акуліна і 12 сербскіх мастакоў, для якіх вершы беларускага паэта сталі крыніцай натхнення для стварэння сваіх твораў. Ідэя праекта належыць сербскаму літаратару і мастаку Міколу Шындзіку. Гэта 13-я кніга ў літаратурна-мастацкай серыі, прэзентацыі якой у 2016 годзе ў Белградзе была прысвечана паэтычна-мастацкая выстава. Настаў час пазнаёміць і беларускага чытача з міжнародным культурніцкім праектам.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5

INSB 978-985-7030-80-4

Каин

Између греха и кривице луташ,
дим ти се у трагу од крви јави,
на кајање је проклет Каин,
пали анђео Љубави



Никола Шиндик — *Паралипомене*

Каін

Між грахом і віной блукаеш,
след дыміцца твой ад крыві,
пакаяннем пракляты Каін,
акаянны анёл Любві.

Ноје

Четрдесет пута секиру усмери
у сватове стаблима убавим
и ковчег свој сагради у вери
да спасава живот Љубави.

Братимио се са сваким зверем,
Као глас сестре слушао кад птица поје
и ковчег саградио с вером
у Господње речи Ноје.

Ћутке је подносио подсмех људи:
— Куд би ти то да путујеш Ноје?

Биље полагао ковчегу на груди
к'о ходочасници на путу својем.

Сучељен с Потопом, победник из боја
испуни Божије воље сплет...
Те није од нуле, већ од Ноја
поново кренуо свет!



Зоран Кричка — *Нојева барка и наоколо*

Ной

Сорак раз пасылаў сякеру
у сваты да сырых камлёў
і каўчэг будаваў свой з веры,
што ўратуе жыццё Любоў.

Давяраўся, як брату, зверу,
з птушкай раіўся, як з сястрой,
і каўчэг будаваў свой з веры
у Гасподняе слова Ной.

Моўчкі зносіў людскія кпіны:
— Дзе ты плаваць сабраўся, Ной?
І ў каўчэг запрашаў расліны,
як паломнікаў, на пастой.

Перамогшы ў вайне з Патопам,
здзейсніў Госпадаў запавет…
І ужо не з нуля, а з Ноя
нарадзіўся нанова свет!

Света ноћ

Осенила ноћ
крилом таме
Марију
што се спрема да роди...
Бог, не сродник
не самоме себи,
не Вечност
којој твоја судба припада,
запали
над Витлејемом
звездано кандило.
Чека те ковчег јасли...
Света ноћ.
Валова кротких стада
три пастирице
скупљају на починак.



Светлана Павловић Циндо — *Света ноћ*

Святая ноч

Сляпіла ноч
улоннаю цямрэчай
Марыі,
што збіралася радзіць…
Бог, не суроч
не сам сябе,
не Вечнасць,
якой твой лёс належыць,
запалі
над Бэтлеемам
зорную лампаду.
Цябе чакае ясельны каўчэг…
Святая ноч.
Валоў рахманых статак
тры пастушкі
збіраюць на начлег.

Пољубац Јуде

Господњи дух се вио над светом,
на тело његово рђа прсла,
и њен је пољубац потом, ето,
склизнуо к’о пуж на земљу, с крста.

Кануће многи народ у Лету,
и време губити своју борбу...
Само ће онај пољубац, ето,
преодолети векова хорду.

Ноћ ће се згуснути над планетом,
Господ се вратити да суди људе...
А онај пољубац ће, ето,
у тами жижак да Му буде.



Вера Станарчевић — *Јудин пољубац и разгледнице из Нигдине*

Пацалунак Іуды


Дух Гасподні лунаў над светам,
цела ела цвікоў іржа,
а ўжо ён, пацалунак гэты,
споўз, як смоўж, на зямлю з крыжа.

Камнем кануць народы ў Лету,
час застанецца без замкоў…
Толькі ён, пацалунак гэты,
пераможа арду вякоў.

Ноч агорне крылом планету,
Госпад вернецца, каб судзіць…
Ну, а ён, пацалунак гэты,
будзе ў цемры Яму свяціць.

Пилат

— Боже, путем ми својим мученика
крвљу судбину смути...
— Оче, и са распећа крај крвника
ја ништа не наслутих.



Миодраг Млађовић — *Под одроном историје*

Пілат

— Божа, твой шлях пакутны
лёс мой заліў крывёю…
— Ойча, ты і распнуты
быў не пачуты мною.

Битка са собом

И врели синајски ветар,
и грифони у слепој хорди тој —
чистили, Господе, теби до таме
да отпочнеш свој бој.

И жене у марамама од црног лана,
и оракулски бучни рој
чистили су до краја дана
да отпочнеш свој бој.

И апостоли — деца твоја,
и Анђео уз трубе златне пој
чистили, Господе, теби до таме
да отпочнеш свој бој.

Ал сваки је, што више може,
сањао тријумф твој над гробом.
И ко би помислио, Боже,
да ти почињеш битку са собом.



Предраг Драговић — *Битка са собом*

Бой з сабой

І гарачы сінайскі вецер,
і грыфоны — сляпой ардой —
мелі, Госпад, цябе наўвеце,
калі ты распачнеш свой бой.

І жанчыны у чорным зрэб'і,
і аракулаў гулкі рой
мелі, Госпад, цябе наўвеце,
калі ты распачнеш свой бой.

І апосталы — твае дзеці,
і Анёл з залатой трубой
мелі, Госпад, цябе наўвеце,
калі ты распачнеш свой бой.

Але кожны з іх, чуеш, кожны
сніў трыумф пераможны твой.
І ніхто й не падумаў, Божа,
што ты бой распачнеш з сабой.

Христова крв

На каменим коленима идола,
на дрхтавим рукама Каина,
у варјашком погледу Ирода,
на светој Плаштаници,
у браздама Слова о походу Игоревом,
на простирци силоване Рогенде,
на стандарду Витолда Великог,
муку Вартоломејске ноћи,
на амвону Софије Полоцке,
у снима Кастуса Калиновског,
на јастуку Максима Багдановича,
у зеленим жилама винограда,
на еполетама Хитлера и Стаљина,
на кошуљи Џона Ленона,
на окапницама чернобиљских болница —
крв Христова,
крв Христова,
крв Христова.



Миленко Михајловић — *Целивања*

Кроў Хрыста

На каменных каленях стодаў,
на дрыжачых руках Каіна,
у вар’яцкім паглядзе Ірада,
на святой Плашчаніцы,
у разорах «Слова аб палку Ігаравым»,
на прасцінах згвалтаванай Рагнеды,
на штандарах Вітаўта Вялікага,
на вусцішы Варфаламееўскай начы,
на амбоне Сафіі Полацкай,
у снах Кастуся Каліноўскага,
на падушцы Максіма Багдановіча,
у зялёных жылах вінаградніка,
на пагонах Гітлера і Сталіна,
на кашулі Джона Ленана,
у кропельніцах чарнобыльскіх хоспісаў —
кроў Хрыста,
                    кроў Хрыста,
                                        кроў Хрыста.

Грешник

Нек ме кажњавају, нека ме свет руши,
нек ме распињу за правду, свеједно —
ја ћу уместо крста да чувам у души,
као Варнава, сечиво ножа ледно.

Пут ме обвија к’о змија, о Боже,
дани ми горче к’о од лободе.
Не с крстом, пред Бога ћу с ножем
у цркву на поклоњење да одем...

Крст је — у Бога, нож је — у Смрти,
а мене душа боли.
У срцу моме, док се крстим,
крст ми о нож к’о сребро звони.



Јошкин Шиљан — *Небојша на тапету*

Грэшнік

Хай за гэта мяне караюць,
хай за праўду распнуць, і ўсё ж —
заміж крыжа ў душы хаваю,
як Варава, халодны нож.

Абвіла, як змяя, дарога,
дні згарчэлі на лебяду.
Не з крыжом, а з нажом да Бога
на паклон у царкву іду…

Крыж — у Бога, а нож — у Смерці,
а душа у мяне баліць.
Як жагнаюся, дык у сэрцы
крыж аб нож серабром звініць.


Марија Магдалена

Ко те натера да се подигнеш с колена,
ко те сачува од греха твог?
Ко твоје име, Магдалена,
пољуби као на причести?
— Бог!

Ко ти души од труљења заклон направи,
Ко те к'о сестру штитио од погледа злог?
Ко ти у празну шаку у паклу стави
Не динар, већ наду?
— Бог!

Ко ти сузу златну с трепавица
претапа у ћилибарски стог?
Ко је разјарена фарисејска лица
претварао у буве?
— Бог!

Ко крвљу својом обележи свој пут дуж света,
Ко библијске ноге пољуби часа тог?
Ко ти прошапута, као ветар,
Алилуја, Маријо?
— Бог!



Здравко Велован — ***!***

Марыя Магдалена

Хто прымусіў устаць з каленяў,
хто цябе ад грахоў збярог?
Хто імя тваё, Магдалена,
прыгубіў, як прычасце?
— Бог!

Хто душу захаваў ад тлену,
хто з табой, як з сястрою, лёг?
Хто паклаў у пустую жменю
не дзінар, а надзею?
— Бог!

Хто слязу залатую з веяў
у бурштын пераплавіць змог?
Хто раз’юшаных фарысеяў
супакоіў, як блох?

— Бог!
Хто крывёю свой шлях следзіў,
Хто прыпаў да біблейкіх ног?
Хто табе прашаптаў, як вецер,
Алілуя, Марыя?
— Бог!


Вавилон

У Вавилону — Каиновом месту —
живот није сладак — на крви је сложен...
У испуцалом погледу с фреске
нема ни капи Љубави божје.

Посегли да буду житељи небеса —
сужњи разврата, јахачи облака млечног...
И Господ их казни због грешног креса
лекцијом, на крок пред улазом у вечност...

Уместо Вере кулу зидали
уз клик да су векове покорили...
Ал изненада горко заридали,
свак на свој начин, ужас орили...

Срозали Вавилон у пуко варварство,
зидови „вечни“ се сруше кад треба,
а с њима и јадно — квазиривалство,
а с њима и лажни — „житељи неба“...



Србослав Илић — *Вавилон*

Вавілон

У Вавілоне — каінавым месце —
жыццё не ў смак — ён вырас на крыві…
І ў позірку патрэсканым на фрэсцы
няма ні кроплі боскае Любві.

Быць захацелі небажыхарамі —
рабы спакусы, вершнікі аблок….
І за гардыню Госпад пакараў іх,
даў ім урок ад вечнасці за крок…


Бо заміж Веры — вежу збудавалі,
перамаглі, як хтось крычаў, вякі…
Ды раптам, як на трызне, заспявалі
кожны па-свойму ўсе галаснікі…

Давёўшы вавілонцаў да вар’яцтва,
абрынуліся «вечныя» муры,
а разам з імі — богапанібрацтва,
а разам з імі — «небажыхары»…

Траг

Није у Јевањђељу,
већ у глини
витлејемској
изгубила траг
побожна Јевросима...

Бог га видео
па од
глине те
прво
сачинио циглу,
а после —
белоруски свет.



Томислав Тодоровић — *Двосмерност*

След

Не ў Евангеллі,
а у гліне
віфліемскай
згубіла след
небаверная Еўфрасіння…

Бог заўважыў
яго
і з гліны
той спачатку
зляпіў цагліну,
а пасля —
беларускі свет.

Ничице

Пред ликом
светог иконоса
ничице лежим,
Оца молим:
— Боже милостиви,
доста си се срдио...
Животворном
Плаштаницом
огрни
Белорусију
моју.



Марјан Флоршиц — *Homo erectus*

Ніцма


Перад лікам
святой бажніцы
кленчу ніцма,
Айца малю:
— Божа літасны,
до гнявіцца...
Жыватворнаю
Плашчаніцай
ахіні
Беларусь
маю.


Плашчаніца
Плаштаница

Изложба
Галерија **ПРОГРЕС, Београд**
23. 09. - 01. 10. 2016.



























АБ ПРАЕКЦЕ

Літаратурна-мастацкая кампазіцыя «Плашчаніца» — вынік творчага супрацоўніцтва Эдуарда Акуліна, паэта з Беларусі, і дванаццаці сербскіх мастакоў. Прачытанне мастакамі гэтых «густых» вершаў (у перакладзе Міадрага Сібіновіча) увасобілася ў праект зборніка, дзе распавядаецца дванаццаць аўтэнтычных, насычаных візуальна аповесцяў, своеасаблівых «выяўленчых фільмаў», і ўсе яны, насуперак адрознаму паэтычнаму і жанраваму ўвасабленню, яднаюцца ў складаную архітэктоніку выставы вершамі з цыкла Эдуарда Акуліна «Плашчаніца». У зборніку змешчана па адной працы кожнага аўтара, «выяўленчай песні», на якую натхніў адзін з вершаў «Плашчаніцы», і гэта стварае кампазіцыю ўсёй выставы, неабходны шкілет спектакля, дзе словы паглядзелі на вас, а карціны загаварылі…

О ПРОЈЕКТУ

Књижевно-ликовна опера Плаштаница резултат је креативне сарадње Едуарда Акулина, песника из Белорусије и дванаест српских ликовних уметника. Ликовно читање ових “густих” стихова (у преводу Миодрага Сибиновића) кумулирало је у овај омнибус пројекат у коме је распричано дванаест аутохтоних, заокружених визуелних приповсти, “ликовних филмова”, а све их, упркос различитим поетичким и жанровским изричајима, у сложени архитектонику изложбе везују стихови из Акулиновог циклуса ПЛАШТАНИЦА,. Ниме, по један рад сваког аутора, једно ликовно певање, управо је изазван једном од плаштаничких песама, те то, тако, и чини арматуру целе поставке, даје нужни скелет представи где речи прогледавају а слике су проговориле.

ЗМЕСТ

Літаратурна-мастацкае выданне

Акулін Эдуард Аляксандравіч

Плашчаніца
Вершы

Рэдактар *Мікола Шындзік*
Перакладчык *Міадраг Сібіновіч*
Карэктар *Наталля Карнеенка*
Вёрстка *Мікола Шындзік, Марына Пятровіч*

Падпісана да друку
Фармат 70x90 1/32
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ул-выд. арк. 1.
Наклад 99 ас. Замова



Індывідуальны прадпрымальнік Сіўчыкаў Уладзімір Мікалаевіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў ад 24.04. 2014 за № 1/325.
Праспект Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск.
siuchykau@gmail.com

Надрукавана ў друкарні ТАА “Палікрафт” .
Вул. Кнорына, 50, г. Мінск.
Ліц. № 02330/466 ад 21.04.2014 г.